Тыднёвік Магілёўскі

№ 9 (40)
8.05.98

Uchodźca polityczny nu

Student z Mohylewa Iwan Obodowskij złożył na przejściu w Kuźnicy Białostockiej wniosek o przyznanie statusu uchodźcy politycznego. Kilka dni wcześniej opuścił areszt. Na Białorusi grozi mu kara pięciu lat więzienia.

Iwan Obodowskij urodził się w październiku 1979 roku w Mohylewie. Był studentem pierwszego roku Instytutu Budowy Maszyn w Mohylewie, działaczem Centralnej Rady Młodzieżowego Frontu Białorusi i członkiem Białoruskiego Frontu Narodowego.



Musiał uciekać

ПАДЗЕЯ ЧАСУ

Магілёўскі актывіст Маладога Фронту Ясь Абадоўскі атрымаў палітычны прытулак у Польшчы.

За апошнія два гады ў сувязі са сваёй палітычнай дзейнасцю неаднаразова ён гвалтоўна затрымліваўся і абшукваўся міліцыяй і "людзьмі ў цывільным". Такім чынам улады правакавалі яго на антыпраўныя дзеянні ў адказ, а калі гэта не атрымалася – абяцалі "высокую пасаду" ў мясцовым БПСМе, адначасова пагражаючы выключэннем з інстытуту... Усе гэтыя "сакрэтныя" мэтады цалкам захаваліся ў нашай краіне з практыкі савецкага КДБ. Пасля таго, як Яся затрымалі ў Менску падчас святкавання 80-годдзя БНР, вечарам таго ж дня ўсё тыя ж "невядомыя ў цывільным" вывозілі хлопца ў Курапаты, каб нагляднa прадэманстраваць свае намеры: не спыніш займацца палітыкай – заб'ем. Але ўжо 1-га красавіка, у міжнародны Дзень гумару, Ясь Абадоўскі браў удзел у пікеце "Ў падтрымку Лукашэнкі" ў Магілёве, а 2-га красавіка ў Менску – ў маладзёвай акцыі пратэсту супраць анэксіі Беларусі Расеяй. Наследкі першай акцыі – позва ў магілёўскі суд, другой – 15 сутак зняволення ў Менску, і яшчэ адна судовая позва, ужо пасля адседкі, у менскі суд. Перад ад'ездам у Польшчу Ясь Абадоўскі даў інтэрв'ю карэспандэнту Радыё Свабода Алесю Дайнеку, якое мы друкуем у гэтым нумары ТМ.

"Мы лічым сябе вольнымі"

Інтэрв'ю Алеся Дайнекі з Ясем Абадоўскім

– Ясь, па-першае, я рады вітаць цябе жывым і здаровым. Напэўна, будзе не залішнім нагадаць перадгісторыю твайго затрымання і тваіх 15-ці суткавых пакутаў.

– Дзякуй вялікі. Нас было прыблізна 25 чалавек. Мы рушылі ад будынка цырка на Ўправу Беларускага Народнага Фронта. Па баках стаялі міліцэйскія машыны, з правага боку нас здымалі на відэакамэру, а з левага стаялі, як іх называюць у народзе, "тихари". На падыходзе да плошчы Перамогі да нас пад'ехалі адразу пяць машын, потым – яшчэ пяць. Выскачылі людзі, не слова не кажучы, пачалі нас збіваць. Білі ўвогуле жорстка. Я бачыў, як білі Лявона Васючэнку і кулакамі, і нагамі. Білі і дзяўчын. На мяне апранулі наручнікі, запіхнулі ў машыну. Усе гэтыя машыны былі без нумароў. Мы так і казалі потым на судзе, што гэтыя людзі – звычайныя бандзюгі, бо супрацоўнікі міліцыі так не могуць збіваць людзей.

– Фізычны ціск на вас быў аказаны падчас затрымання, а далей ці аказваўся на вас псыхалягічны ціск?

– Забаранялі паліць, нават забаранялі хадзіць у прыбіральню, паліць вады. Вось такое было ў пастарунку.

– Ну а сам судовы працэс? Паводзіны суддзі? Ці было гэта ўсё аб'ектыўна, ці было адчуванне, што ўсё ўжо папярэдне вырашана?

– Ну канешне вырашана загадзя. Была маладая суддзя, якая проста сядзела і раілася з мянтамі, што каму напісаць і даваць. Самы галоўны аргумэнт – што ты ішоў. Ішоў па праспэкце Францішка Скарыны ...

– Як да вас ставіліся сукамернікі?

– Да нас ахоўнікі нармалёва ставіліся. Яны гаварылі: "Вы, хлопцы, толькі нідзе не кажыце пра гэта, але мы з вамі салідарныя, мы да вас ставімся не як да астатніх, напрыклад, вось да гэтых алкашэй. Мы вас проста паважаем". Ну, а з сукамернікамі ў нас увогуле былі добрыя адносіны. Мы, здаецца, усіх там заагітавалі ў дэмакратычны рух.

– Якія ў цябе нарадзіліся думкі пасля таго, як ты непасрэдна сутыкнуўся вось з гэтай бязлітаснай судовай машынай, якая сёння працуе не на правасуддзе, а на ўладу?

– Калі нас пасадзілі ў камэру, мы ўсё думалі: за што ж нас пасадзілі? А потым мы праз газэты, якія нам перадавалі ахоўнікі, гэта былі "Свабода" і "Народная Воля", мы даведаліся, што сядзіць Паша Севярынец, што ўзбуджаная крымінальная справа ... Мы зразумелі, што яны хочуць запалохаць моладзь. Мы ж неаднойчы бачылі, як "бралі" толькі моладзь, збівалі і палохалі заўсёды непаўналетніх. Мы бачылі, які стан быў у хлопца, які трое сутак прасядзеў у Савецкім РАУСе. У чалавека проста можа з'ехаць дах ад усяго, што яны робяць з моладдзю. Гэта цэлая сістэма. Лукашэнка хоча запужаць моладзь. Але беларуская моладзь будзе жыць заўсёды.

– Як ты лічыш, чаму менавіта на моладзь зараз абрынаецца асноўны ўдар паліцэйскай машыны?

– Таму што моладзь выходзіць, моладзь не баіцца. Мы пераадолелі той страх, які быў да 1991 года. Мы лічым сябе Вольнымі. А калі пасядзіш 15 сутак, то не толькі гэта не адбівае ахвоту займацца палітыкай, а наадварот: яшчэ больш зьяўляецца жаданьня працаваць. Працаваць, каб мы перамаглі.

Далёка да сумленнай цішыні...

Другая сусветная вайна, савецкая Перамога ў якой шырока святкуецца ў Расеі і ў нас, – адна з найбольш балючых і складаных для асэнсавання старонак найперш эўрапейскай гісторыі... І блізка стаім, і баімся...

Аднак высілкамі сумленных гісторыкаў, пісьменнікаў, удзельнікаў Вайны паступова ўсё больш зразумелым становіцца Факт: у другой сусветнай вайне сышліся на смерць дзве па сутнасці аднолькавыя палітычныя сістэмы, два аднолькавых дзяржаўных рэжыма. І пераможцы, і пераможаныя – ахвяры гэтых сістэмаў і рэжымаў. Адны, прайграўшыя, гэта асэнсавалі і ўсвядомілі. Другія, выйграўшыя з дапамогай незлічоных стратаў, стараннямі ўчорашніх і сённяшніх ідэолагаў "савецкага патрыятызму", працягваюць рамантызаваць вайну, надаваць ёй выключна герaічны сэнс, ліслівіць ветэранам, застаўшымся ў жывых, як гаворыцца, нягледзячы ні на што. На словах ліслівіць, памятнымі знакамі, маршамі ды ўрачыстасцямі, гучнасцю прамоў і аркестравых літаўраў. Бо сапраўдная павага да іх патрабавала б зусім іншага стаўлення да тых, каму выпала няшчасным савецкім лёсам стаяць на смерць за сталінскую, і без таго знішчальную антычалавечую сістэму. Калі захісталася яна, тады толькі ўспомніў геніяльны правадыр народаў пра "братоў і сясцёр", пра Мініна з Пажарскім, пра Отечество...

Цяжкая, складаная, балючая тэма... Аднаго не мае на ўвазе ТЫДНЁВІК – пакрыўдзіць салдатаў вайны, ды і ўсіх нас, зразумела, каго дастае вайна кожнага 9 Мая. Дастае болем і роздумам, памяццю і слязьмі. Яны ачышчальныя... Можа таму штогод улада і шчыруе перагучыць іх літаўрамі і барабанным боем... Радавы салдат вайны, паэт і філосаф Булат Акуджава ўсё жыццё прасіў зрабіць гэты дзень Днём цішыні і ўласнага для кожнага нармальнага чалавека смутку. Пра гэта даўно нагадвае землякам другі пісьменнік і філосаф Васіль Быкаў... А мы ніяк не пачуем...

ТЫДНЁВІК



...ў гаварыў, нас запэўніваў.
...ік няма. Нам кажуць – мы верым.

Максім КАСТРЫЦА

Пакуль гучыць роднае слова

На гэтым тыдні ў Магілёве адбылася падзея, якая па свайму чалавечаму сэнсу пераўзыходзіць усе грамадзянскія акцыі апошняга часу. Пісьменніцкія магілёўскія сустрэчы, магчыма, стануць найбольш дзейсным уплывовым фактарам на свядомасць і самыя душы нашых стаміўшыхся землякоў. Падчас такога стамлення менавіта РОДНАЕ СЛОВА можа ўратаваць чалавека ў ягонай самоце і неспакоі. З таго найбольш выбітныя беларускія пісьменнікі і прадпрынялі сёлета свае літаратурныя дэсанты ва ўсе вобласці краіны. З таго і ўлада паўсюль чыніла іхным сустрэчам з моладзю, чытачамі сталага ўзросту, мясцовай інтэлігенцыяй адкрытыя або "подленькие" перашкоды. Не абыйшлося без іх і ў нас, хаця з большага, трэба прызнаць, амаль усе запланаваныя сустрэчы адбыліся. Пазначыць гэты факт нейтральным інфармацыйным тонам не выпадае. Нельга асобна не падкрэсліць цёплую, шчырую і адкрытую атмасфэру, якая ва ўсіх аўдыторыях панавала на пісьменніцкіх выступах. Гучалі вершы, урыўкі з празаічных твораў. Былі расповяды аб творчых планах. Былі шчырыя гаворкі аб тым, што хвалюе, а іншым часам бянтэжыць і палохае.

Усе пытанні ва ўсіх аўдыторыях, а гэта былі школы і коледжы, універсітэт і гарадскі дом культуры, можна звесці да аднаго: а ці ёсць яна, наша родная Беларусь, ці быць ёй вольнай краінай, ці жыць народу нашаму па сучасных мерках эўрапейскага ўзроўню?..

Кожны з нас па-свойму адказвае на гэтае пытанне. Па рознаму адказвалі на яго і нашыя госці. Аднак сутнаснага разыходжання сярод іх не было. Яны не толькі вераць, што толькі станоўчы адказ мае вартаснасць і сэнс. Яны працуюць і жывуць на тое, каб гэта здейснілася і адбылося хутчэй. Праца звычайная, праца палітычная маюць тут вялікае значэнне. Немагчыма аднак дасягненне мэты без працы душы. Адзіны матэрыял для яе прасвятлення і для яе непераможнай сілы. Гэты матэрыял - слова. Слова, забяспечанае думкай. Слова, аплочанае роздумам. Слова мастацкае.

Роднае слова... Яно гучала ў Магілёве амаль увесь тыдзень, робячы шчаслівымі тых, хто не абмінуў спатканні з Генадзем Бураўкіным, Уладзімірам Арловым, Лявонам Баршчэўскім, Міхасём Скоблам.

Аддзел навінаў ТМ

На літаратурнай вечарыне, якая адбылася ў ГДК, лідэр маладога фронту Андрэй Кавалёў разам з пісьменнікам Уладзімірам Арловым павіншавалі пераможцаў конкурсу сачыненняў на тэму "Беларусь маімі вачыма". Гэтыя прозвішчы сярэдніх і старэйшых магілёўскіх школьнікаў мы падаем вялікімі літарамі: МАКСІМ КАМАРОЎ, ПАВАЛ ЖУЙКОЎ, АНЖЭЛА БАРЫСЕНКА, МАРЫЯ КРУКОЎСКАЯ, АЛА БАНДУРЫНА, ВОЛЬГА КУЛЯШОВА, АЛЕСЬ ГАЛАНЧАНКА, МАША ХОРТАВА, ГАННА БОНДАРАВА, АЛЕСЯ ДРУГАЧЭНКА, ВАЛЕРЫ ШАЛАШКЕВІЧ, ЯЎГЕН ЗАДЗІРАН. За любоў да Беларусі дзякуй іх бацькам і настаўнікам.

Віншуем пераможцаў літаратурнага конкурсу і мы – рэдакцыя ТМ.

Гуртуецца дэмакратычная моладзь

15 красавіка з ініцыятывы шэрагу маладзёвых арганізацыяў Магілёва створаны цэнтар "Ратуша".

Чынны ўдзел у працы Устаноўчага сходу новага грамадскага аб'яднання ўзялі прадстаўнікі філіяў Маладога фронту, Моладзёвага хрысціянска-сацыяльнага саюзу, Грамадзянскага Форуму, а таксама згуртавання "Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу" і экалягічнага клюбу "Ноасфэра". Былі прынятыя часовыя Палажэнне і Рэглямант цэнтра.

Стварэнне цэнтра "Ратуша" сталася лягічным завяршэннем тае працы, што йшла ў шэрагах маладзёвых арганізацыяў пасля ўсведамлення імі неабходнасці каардынацыі сваёй дзейнасці, аб'яднання намаганняў у дасягненні як сваіх статутных мэтаў і задачаў, так і агульнай мэты пабудовы дэмакратычнага адкрытага грамадства.

Дзверы "Ратушы" адчыненыя для любой неўрадавай маладзёвай арганізацыі Магілева і вобласці, якая спрыяе адраджэнню і ўмацаванню Беларусі як незалежнае дзяржавы.

Цэнтар "Ратуша" утвораны на прынцыпах роўнасці, партнэрства, узаемадапамогі, якія на думку заснавальнікаў, стануцца грунтам пашырэння кола сяброў "Ратушы".

Інфармацыю пра Цэнтар можна атрымаць праз тэлефон 22-97-82.

Каардынатар Цэнтра
Валадар ЦУРПАНАЎ

ЧАРНОБЫЛЬ: ЗАКРЫЦЦЁ ТЭМЫ

Камітэт сказаў уладзе апошняе "Даруй"...

Магілёўскі грамадзянскі камітэт "Дзеці Чарнобыля" распаўсюдзіў для сродкаў масавай інфармацыі СПАВЕШЧАННЕ аб сваёй адмове ад статусу юрыдычнай асобы.

Проста гаворачы, камітэт як грамадская арганізацыя спыніў сваю дзейнасць, якая пасьпяхова і эфектыўна доўжылася 7 гадоў. У пазначаным вышэй дакумэнце, падпісаным старшынёй камітэта Наталляй Рославай, усё падрабязна і абгрунтавана тлумачыцца. Вось некалькі цытатаў.

"Аўтарытэт і вядомасць у грамадстве камітэт набыў, дзякуючы сваёй асветніцкай дзейнасці, спрыянню кантактам і партнерству грамадскіх аналагаў Эўропы і Беларусі, збору грамадска-значнай чарнобыльскай інфармацыі і адкрытасці яе абмеркавання. Шмат колькі зроблена ў кірунку аказання гуманітарнай, лекавай, медыцынскай, аздараўленчай, матэрыяльнай дапамогі як дзецям, так і дарослым. Наш камітэт быў кансультатыўнай прыёмнай, інфармацыйным бюро, клюбам маладзёвых згуртаванняў, прыступкай для міжнародных сувязяў... Шматбаковая дзейнасць камітэта праходзіла пры адсутнасці нават мінімальнага спрыяння з боку дзяржавы, якая на свае сродкі ўтрымлівае дзесяткі "псэўдаініцыятыў", якія ствараюць ілюзыю (для замежнага карыстання) праваў і вольнасцяў у Беларусі ў той час, як прастора для апошніх практычна знішчына дыктатурай і яе бюракратычнай машынай... Сем год назад мы заявілі просьбу аб наданні нам статусу юрыдычнай асобы. Тым самым мы засведчылі сваю гатоўнасць да супрацоўніцтва з дзяржавай, законапаслухмянасці і да сваёй падкантрольнасці. Мы выконвалі ўзятыя на сябе абавязкі і ніводнага разу не далі падставаў для кампрамату і выкрыцця "парушэнняў", годна і спакойна перажыўшы дзесяткі самых жорсткіх праверак і рэвізый. Але апошнім часам дзяржаўны націск на камітэт, працэс безпадстаўнага кантролю з боку ўлады дасягнуў мяжы прыстойнасці, перараўтварыйшыся ў самадурства і здек. Мы стаміліся ад страты часу на барацьбу з "ватнымі сценамі". Мы стаміліся ад пагрозаў, правакацый і пільнавання. Мы вырашылі дэманстратыўна пакінуць спіс "юрыдычных асобаў" і перайсці на больш прадукцыйны ў нашай краіне мэтад прыватных дзеянняў, якія будуць забяспечаны створанай інфармацыйнай базай, наладжанымі сувязямі, нашымі доследамі, трываласцю і перакананасцю... Мы вызваляем свой, створаны сваімі высілкамі, прыстойны офіс, разлічваемся за нібыта існуючую ў камітэта запазычанасць "за кватплату", налічаную нам "судом" за 15 хвілінаў слухання справы, і гаворым уладзе апошняе "даруй". Смешна, аднак, што наша рашэнне выклікала ва ўлады (на жаль, не толькі ў яе)... не, не радасць... а злосць і агрэсіўнасць. Але нас ужо нічым не здзівіць. Адное цешыць: у такой смешнай улады свая трагедыя яшчэ наперадзе."

Чытаць спавешчанне (яно значна большага памеру, чым пададзена тут) цяжка. Аднак не толькі за цяперашнюю ўладу балюча і горка, калі разважаеш над адчайнымі, хаця і афарбаванымі вытрымкай, радкамі апошняга ліста камітэта. Балюча і за ўсіх нас, хто смела адносіць сябе да дэмакратычнага нацыянальнага асяродка, апантанага клопатамі аб "светлым дні роднай краіны"... Не хутка прыйдзе ён, гэты дзень, пры такіх абыякавасці і спакоі, з якімі сустрэта абласной і гарадской "дэмакратычнай грамадскасцю" паведамленне аб сконе знакамітага камітэта, работу якога заўсёды адрознівалі канкрэтнасць і рэальныя вынікі. Відаць, не хутка наканавана нам, беларусам, пераадоліць свае зайздрасць і рэўнасць, адасабленне і няўменне падначаліцца "агульнай тэме". З таго і пакутуем, з таго і маем тры дзесяткі партый на адзін лёзунг, з таго і бье ўлада, жартуючы, каго захоча, не баючыся зьяднанага адпавяду. Бо кожны ўцалелы – ці не часова? – думае не надалей, чым... аб сабе. Хаця і не пагодзіцца, зразумела, гэты НАШ КОЖНЫ з такім абвінавачваннем. Бо няма нічога прасцей, як вядома, чымсьці дамовіцца... з самім сабой. А не хапае тым часам нам дамовы паміж сабой. Што далёка не адное і тое.

Генадзь СУДНІК

Беларуская дыяспара ў замежжы

"Дыяспара (ад грэч. diaspora – рассейванне) – знаходжанне значнай часткі народа (этнічнай супольнасці) па-за краінай яго паходжання".

З энцыклапедыі.

На рубяжы XIX–XXстст. эміграцыя з беларускіх зямель набывае выразны эканамічны характар, што было выклікана развіццём капіталізму, фарміраваннем рынкавых адносін і, як вынік, утварэннем сусветнага рынку працоўнай сілы. Першая хваля працоўнай эміграцыі за межы Расійскай імперыі (пераважна ў ЗША, Канаду, Аргентіну, Бразілію) ахапіла ў зазначаны час не менш 500-600 тыс. нашых суайчыннікаў. Акрамя таго, у выніку правадзімай царскім урадам міграцыйнай палітыкі на працягу 1896-1912 гг. з беларускіх губерняў у Сібір і ўсходнія раёны Расіі перасяліліся 717 тыс. чалавек, пераважна малазямельных і сярэдніх сялян.

Наступная, другая хваля эміграцыі з беларускіх зямель у XX ст. мела палітычны характар і была выклікана падзеямі першай сусветнай і грамадзянскай войнаў і рэвалюцыяй 1917 г. у Расіі. Толькі ў выніку прымусовай эвакуацыі насельніцтва ў 1915 г. пры наступленні нямецкай арміі з тэрыторыі Беларусі былі выселены ў расійскія губерні звыш двух мільёнаў чалавек, значная частка якіх не вярнулася абратна.

Трэцяя хваля эміграцыі, што прыпадае на 1920-30-я гг., насіла пераважна эканамічны характар. Яе складаюць прыкладна 180-250 тыс. жыхароў Заходняй Беларусі, што выехалі на працягу 1921-39 гг. па працоўных кантрактах у ЗША, Канаду, Аргенціну, Уругвай, краіны Заходняй Еўропы, і [redacted] першых пяцігодак і ў аддаленых раёнах Расійскай Федэрацыі.

Харэктарызуючы гэтую хвалю эміграцыі, яе пераважна эканамічную, нельга не зазначыць наяўнасці ў разглядаемым перыядзе і калізіі сацыяльна-палітычнага характару, звязанных з раскулачваннем і высылкай за межы БССР на спецпасяленне кулацкіх элементаў, "нацдэмаў" і інш., а таксама калізіі канфесіянальнага плана, звязанных з дэпартацыяй за межы рэспублікі служыцеляў культу розных канфесій як носьбітаў варожай марксізму ідэалогіі.

Чацвёртая хваля набыла пераважна этнічны характар і была выклікана ажыццяўлёнымі ў лютым 1940 г. -чэрвені 1941 г. чатырма буйнымі дэпартацыямі з Заходняй Беларусі ў паўночныя і ўсходнія раёны СССР колькасна значных груп насельніцтва (пераважна палякаў, а таксама беларусаў і інш.).

Пятая хваля эміграцыі прыпадае на часы ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў гады другой сусветнай вайны (1941-1944 гг.). Яе вызначаюць перш-наперш палітычныя прычыны (эвакуацыя каля 1,5 млн. чалавек летам 1941г. ва ўсходнія раёны СССР; эміграцыя значных апазіцыйна настроеных да савецкай улады груп беларускага насельніцтва на захад у 1944 г. разам з адступаючай нямецкай арміяй). Нельга ігнараваць і эканамічныя прычыны: не менш 400 тыс. нашых суайчыннікаў былі вывезены ў час акупацыі з тэрыторыі Беларусі на прымусовыя работы ў Германію. Значная частка гэтых людзей не вярнулася на радзіму.

Чарговая, шостая хваля эміграцыі з беларускіх зямель, што прыпадае на першыя пасляваенныя гады, носіць выразна этнічны характар. Выклікана яна, у першую чаргу падпісанымі паміж СССР і ПОЛЬШЧАЙ дагаворамі аб савецка-польскай мяжы і "абменах насельніцтвам", у выніку чаго да канца чэрвеня 1947 г. на тэрыторыю Польскай Рэспублікі перасяліліся з Беларусі звыш 338 тыс.чалавек, пераважна запісаўшыхся "палякамі" беларусаў-католікаў.

Сёмая хваля эміграцыі з беларускіх зямель насіла "унутраны" характар і была выклікана эканамічнымі прычынамі: асваеннем цалінных зямель і патрэбаў у забеспячэнні буйных новабудоўляў ва ўсходніх і паўночных рэгіёнах СССР працоўнымі рэсурсамі. Пік гэтай "хвалі" прыпадае на 1950-60-я гг. Толькі на асваенне цалінных зямель з Беларусі, пачынаючы з 1954г., выехалі (пераважна ў Казахстан) 237 тыс.чалавек (каля 179 тыс.чалавек – па аргнабору і звыш 58 тыс. – па камсамольскіх пуцёўках).

Вызначаючы сем хваляў адтоку насельніцтва з беларускіх зямель у XX ст., кожная з якіх змяняла лёсы соцень нашых суайчыннікаў, нельга не адзначыць наяўнасці таксама менш буйных міграцыйных плыняў, выкліканых шэрагам іншых прычын. Так, па канфесіянальных прычынах, у адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 3.03.1951 г., былі выселены з Беларусі ў Іркутскую і Томскую вобласці веручыя нетрадыцыйнага пратэстанцкага кірунку – Сведкі Еговы. Тысячы нашых суайчыннікаў былі вымушаны пакінуць тэрыторыю Беларусі па экалагічных прычынах, звязаных з вынікамі аварыі на Чарнобыльскай АЭС і г.д.

Асобны прадмет утварае геапалітычны феномен змен міждзяржаўных межаў Беларусі без уліку этнічнага фактара. Так, на аснове міжнародных дагавораў і пагадненняў былі перададзены: Літве 12.07.1920 г. - Віленскі край разам з г. Вільняй і часткай іншых этнічных беларускіх зямель; Латвіі 1.08.1920г. - тры паветы з пераважна беларускім насельніцтвам разам з г. Дзінскам; Польшчы 18.03.1921 г. - заходнебеларускія землі з насельніцтвам 4,6 млн. чалавек і тэрыторыяй 113 тыс. кв. км; Літве 10.10.1939 г. - Віленскі край (паўторна) разам з г. Вільняй; Літве 6.11.1940 г. - прыгранічныя этнічныя беларускія землі разам з гарадамі Свенцяны, Салечнікі, Друскенікі; Польшчы 20.09.1944 г. - 17 раёнаў Беластоцкай вобласці і 3 раёны Брэсцкай вобласці.

У выніку гэтых і іншых геапалітычных калізій сотні тысячаў нашых суайчыннікаў (без змены свайго месца пражывання) апынуліся за мяжой краіны, сталіся грамадзянамі іншых краінаў, утварылі сабой аўтахтонную дыяспару. А ўвогуле за дваццатае ст. прыкладна 3,5 - 4 млн. беларусаў (практычна кожны трэцці) пачалі жыць па-за межамі гістарычнай радзімы, утварыўшы дыяспару, на якую проста немагчыма не звяртаць усёй належнай увагі. Да іх далучыліся і тыя беларусы, што жывуць "па-за межамі" былой адзінай краіны - СССР. Усіх іх налічваецца прыкладна 2млн. 130 тыс. чалавек.

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

У ЗША колькасць нашых выхадцаў 600-650 тыс., крыху менш у Канадзе, у Паўднёвай Амерыцы - да 400 тыс. У Польшчы жыве больш за 250 тыс. беларусаў. Даволі значныя асяродкі беларусаў пражываюць у Аўстраліі, ФРГ, Вялікабрытаніі, Бельгіі.

Паўсюдна беларусы ўтварылі свае нацыянальныя арганізацыі - жаночыя, маладзёвыя, ветэранскія, студэнцкія, літаратурныя, палітычныя. Яны падзяляюцца ў сваю чаргу на мясцовыя, рэгіянальныя, цэнтральныя, міждзяржаўныя. І паўсюдна беларускія арганізацыі добра ўсведамляюць неабходнасць рабіць справы на карысць Бацькаўшчыны, уносіць свой дадатак да яе літаратуры, мастацтва, навукі і г.д. На першым месцы тут безумоўна стаіць друк, перыёдыка.

Аднак пра гэта мы пагаворым наступным разам.

Ігар ПУШКІН,
дырэктар музэя гісторыі Магілёва

Сакрат Яновіч з Янам Чыквіным і Вайцехам Семянам перад пачаткам літаратурнага вечара "Белавежы" ў Старамейскім доме культуры ў Варшаве, 18 лістапада 1994 г.

Нам кажуць – мы верым

ПАМФЛЕТ



Эт, каб на яго: думкі так і круцяцца, так і мільгацяць, адна аб другую спатыкаючыся. І ўсё пра сябе. І ўсе, каб на іх зараза, услых не прамовіш. Хаця быццам бы і не ў паліцэйскай дзяржаве жывем, а ў самай што ні ёсць "найдэмакратычнай". Нам, неразумнікам, гэта ледзь ці не штохвілінна ўбіваюць ідэалагічнымі цвікамі ў нашы і без таго зацюканыя "шчаслівым" жыццём галовы.

Яно, праўда, іншым разам неяк засумняваешся. Чаму гэта, думаеш, наша першая дзяржаўная асоба ўсё нейкіх "дзермакратаў" лае. Во, кажа, у сябе ў рэспубліцы-калгасе трохі прыдушыў іх, дык яны, паршыўцы, з расейскай сталіцы гаўкаюць. А яшчэ, бывае, задумаешся: чаго гэта ў нас на кожных 4-х чалавек на аднаму міліцыянту-дармаеду прыпадае, а, скажам, у забугорнай Нямеччыне адзін паліцыянт на паўтысячы чалавек. Чаму? Кажуць, так трэба.

Нам кажуць – мы верым. Вымуштраваныя так. Звыкліся. І асабліва, калі гавораць самыя-самыя высокапастаўленыя. Напрыклад, наш зямляк з Рыжкавіч. Мы ж самі думаць не вывучаны. Дый навошта самастойна думаць, параўноўваць, супастаўляць, аналізаваць? За нас вуснамі сваіх заказчыкаў гэта штодзень вунь як зацята шчыруюць дзяржаўныя электронныя і друкаваныя СМІ-утрыманцы.

Яны, напрыклад, паведамляюць, што сярэдняя зарплата грамадзян з пачатку гэтага года склала звыш трох з паловай мільёнаў рублёў. А тымчасам рабочыя Клічаўскага ДОКа, што нейкі час таму быў з малатка прададзены замежнай фірме, ад радасці нядаўна ажно ў скокі пусціліся. Яшчэ б! Яны ж зараз зарабляюць ажно па два мільёны рублёў. Во які прагрэс, бо да продажу свайго прадпрыемства ўсяго па 500-600 тысяч у месяц на кожнага брата-докаўца перападала. Так, расце ў нас зарплата, расце. Бы на дрожджах. Афіцыйна нам сцвярджаюць, што цяпер яна па рэспубліцы ў сярэднім складзе ўжо 67 "баксаў". Ну, як тут не жыць прыпяваючы, як не маліцца на прэзыдэнта з такімі грашыма. Жыві сабе ды радуйся!

Адно толькі крышачку азмрочвае радасць. Кажуць, быццам у нас інфляцыя ніяк не хоча слухацца ні ўрада, ні нават самога Лукашэнкі. Ніяк, пераложная, не хоча яна запрэгчыся ў адведзеныя ёй месячныя 2-працэнтныя цуглі, хоць ты вазьмі ды пасадзі яе ў турму, як Лявонова або Старавойтава. Яна, каб на яе паралюш, у 1996 годзе ўзяла і вырасла на 39 %, а летась, гэткі неслух, падскочыла да 63 %. На яе, з глузду зьехаўшую, ніякага няма стрыму і сёлета. І што яна сабе думае, што яна робіць з аўтарытэтам няшчаснага прэзыдэнта. І бач ты яе: ніякога сілка-дэкрэта, ні пугаўя-указа на яе, ашалелую, не знаходзіцца. Няўжо нават Замяталін разам з Зімоўскім ніяк тую інфляцыю не ашоўраць? Хай сабе хоць на словах. Яна ж, як кажа адзін вядомы чалавек са Шклоўшчыны, ужо абрыдзела ўсім...

Ну і што? Затое ў нас летась рост прамысловай вытворчасці на 17 % па афіцыйнай статыстыцы атрымаўся і на 10 % рост валавога ўнутранага прадукту выйшаў. Ды і сёлета сямімільнага жару даем. Толькі за першыя два месяцы ВУП павялічыўся на 11 %, а аб'ём выпуску прамысловай прадукцыі ўзрос аж на 13 %. Во даем, во шпарым! На здзіў Эўропы ўсёй.

Няпраўду, вядома ж, кажуць розныя там дзермакраты, апазыцыянэры-празаходнікі разам з сацыёлагамі-незалежнікамі, быццам мы сярод краінаў СНГ па жыццёваму ўзроўню, па росту цэнаў ледзь ці не параўналіся з ваюючым Таджыкістанам. Хлусня, мабыць.

Каб разабрацца ў гэтым, давайма успомнім вядомыя лічбы і зробім іх супастаўленні. Выкарыстаем мінулагодняя дадзеныя ў параўнанні з годам папярэднім. Летась, такім чынам, цэны ў супастаўленні са снежнем'96 выраслі:

на мясапрадукты: у Расеі – на 10 %, Арменіі – на 16 %, Казахстане – на 11%, Малдове – на 7%, Беларусі – на 61%, Таджыкістане – ў 34 разы;

на малако і малочныя вырабы: у Расеі – на 6%, Арменіі – на 15 %, Малдове – на 9%, Кыргізіі – на 5%, Беларусі - на 39 %, Таджыкістане – на 121%;

на алей: у Расеі – на 22%, Арменіі – на 21%, Казахстане – на 18%, Кыргізіі – на 27%, Беларусі – на 82%, Таджыкістане – ў 3 разы;

на масла сметанковае: у Расеі цэны зменшыліся на 3%, а ў Азэрбайджане – на 5%, узраслі цэны ў Арменіі – на 11%, Казахстане – на 3%, Беларусі – на 62%, Таджыкістане – ў 3,1 раза;

хлеб і хлебабулачныя вырабы: у Казахстане сталі танней на 3%, у Азэрбайджане і Кыргізіі засталіся на ўзроўні папярэдняга году, у Расеі падняліся на 5%, Арменіі – на 18%, Беларусі – на 69%.

Во, ліха яго забяры: нешта і напраўду з цэнамі ў нас ня тое. Як з вайной у Таджыкістане ўсё роўна. Не ўтаймоўваюць гэтыя бандыты-цэны і сёлета. Наадварот, растуць неймаверна. Нам дык што? Як сказаў некалі Лукашэнка, чарка і шкварка ў брата-беларуса заўсёды знойдуцца. А беднаму прэзыдэнту ад такога жыцця – адзін непакой. Ці то ён на зайздрасць кіраўнікоў дзяржаваў усяго свету адпачывае сабе на здароўе разам з сынам і самымі блізкімі аднадумцамі ў Нагана, ці то вучыць дэмакратыі па-беларуску непаслухмяны Захад, ці дзеля міжнароднага прарыву асвойвае прасторы Ірану, Сірыі або Югаславіі, ці то становіцца на лыжню ў Мурманску – усюды непакой. Растуць у Беларусі цэны...

Ну і што? Хай растуць. Затое ў нас самы высокі рэйтынг прэзыдэнта. Згодна праведзенага ў пачатку гэтага году афіцыйнага апытання, яму безагаворачна давярае 22% рэспандэнтаў, шмат тых, хто больш давярае, чым не, і нямала такіх, якія часткова давяраюць. А ўсіх агулам атрымліваецца 51%. Во як! Куды там да такіх працэнтаў якому-небудзь расейскаму прэзыдэнту. Яно і не дзіўна. Ельцыну ж, па словах Лукашэнкі, ужо, дзякаваць Богу, усе 80, а яму толькі 40. Словам, ёсць чым і кім нам ганарыцца, ёсць.

А тое, што наш "зайчык" нядаўна з ланцужка сарваўся і зноў загалапіраваў разам з цэнамі, – з дробязей драбніца. Проста кіраўнік краіны ў гэты час быў за мяжой. Вярнуўся, унік ва ўсе абставіны, і ўсё і ўсіх паставіў на месцы. Як казалі старажытныя мудрацы, – прыйшоў-убачыў-перамог. А гэты распухлы ад тлусту даляр хай сабе са злосці яшчэ больш зелянее. Гэты амерыканскі вырадак, па прагнозах цвярозых і ведаючых эканамістаў і фінансістаў, хоча быццам бы і надалей нахабнічаць. Хай паспрабуе. У нас жа цяпер Нацбанк узначальвае не абы хто, а заслужаны будаўнік рэспублікі. Так што дарэмна гэты ненавісны бакс збіраецца да канца года за адну гатуку-адзінку сябе 100 тысяч штук-адзінак беларускіх патрабаваць.

А калі нават і так, дык што? Былі ў нас грошы і будуць. Дзяржава вунь летась у два разы іх масу павялічыла. Бо так трэба, тлумачаць. Маўляў, эмісійныя крэдыты. Дык сёлета такіх крэдытаў на друкарскім станку можна будзе колькі хочаш навыпускаць... Ведама, гаспадар – пан. Свая рука – уладыка. Што захацеў – зрабіў. Адных, хто можа пярэчыць і доказна адстойваць правільнасць сваёй думкі, – у адстаўку. Другіх, больш разумных і шматвопытных, хто не згаджаецца, крытыкуе, высмейвае, пратэстуе, хто скептычна, а то і саркастычна выказваецца накошт мадэлі рынкавага сацыялізму, – у турмы. А тых, хто нестамляльна спявае дыфірамбы і па-піянэрску заўсёды гатовы прыкласціся не тое што да спіны, а і ніжэй, – у самыя высокія кабінэты. А не атрымліваецца з мадэллю – ворагаў пашукаць: і на Захадзе, і ў Расеі, і ў сябе дома. Хай на іх усе электарацкія шышкі валяцца, хай на іх уласныя грахі, пралікі і неабачлівасць спісваюцца. Галоўнае, каб раскруціць тых "ворагаў" пад момант і не без умельства. Тут ужо рознага кшталту кіселі, зімоўскія, рыбаковы і г.д., і г.д., пастараюцца. Ім толькі ідэйку якую, карт-бланш які ў 32 мільёны "зялёных" падкінь, астатняму вучыць ня трэба. Разумеюць. Во каб усё насельніцтва, асабліва моладзь, такім было. І БПСМ, з мільярднымі ўліваннямі ў яго, не спатрэбіўся б. Любата!



А то плявузгаюць нейкую непатрэбшчыну, быццам у нас пры ўсім нашым здзіўляючым эканамічным уздыме і пастаянным, з 1995 года, росце жыццёвага ўзроўню нямала ёсць прыхаванага банкруцтва. Прадпрыемствы там розныя, калгасы, саўгасы. Нібы многія з іх вось-вось працягнуць ногі. Нешта не верыцца. Абяцаў жа нам некалі ў жніўні 1994-га прэзыдэнт за паўтара-восем месяцаў запусціць іх усе на поўную катушку. Маўляў, не выканаю гэтага абяцання – сам у адстаўку падам. Не падае, бо запусціў. Ды яшчэ як! Іншым разам – да немагчымасці.

Ну і што? Усяго-наўсяго гэта невялічкія і, мабыць, непазбежныя "накладанні" нашага [illegible] шляху эканамічнага развіцця і мацавання матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва. Ды плюс да таго ўсякія замудрагелістыя стагнацыі ўперамеж са стагфляцыяй.

Яно, вядома, крыўднавата трохі за наш цярплівы рабочы клас. Напрыклад, за калектыў Быхаўскага маторарамонтнага завода. Як укапанае, стаіць, заглухла прадпрыемства. Ні табе звыклага некалі гулу станкоў, ні табе скрыгату метала, што дні напралёт шліфаваўся тут, абточваўся. Ні табе бадзёрага перакліку-гоману рабочых. Стаіць завод. Стагфляцыя чыстай вады яго напаткала. Калектыў даўно ўжо ў беспрацоўныя падаўся. А куды ж яшчэ кінешся пры цяперашніх уладах?..

Неяк не па-людску атрымліваецца і з магілёўскім ААТ "Вольт". Нарамантавалі тут на сваю галаву ўсякіх электрарухавікоў, рознага трактарнага абсталявання, зварачных агрэгатаў. Для вяскоўцаў стараліся, каб яны, якіх нястомна вучыць былы дырэктар саўгаса "Гарадзец", добра і ў тэрмін аралі, сеялі, касілі, жалі, убіралі, дабіваліся важкіх надояў, высокіх прывагаў. А яны, выяўляецца, у тых сваіх калгасна-саўгасных вёсках без грошай сядзяць. Зусім неплацёжаздольныя. Па той прычыне і назапасілася на складах "Вольта" гатовай прадукцыі без малога на 5 мільярдаў "зайцаў". Добра яшчэ, што на прадпрыемстве хоць нейкі выйсце знайшлося. У пачатку года ўзялі і перавялі калектыў на чатырохдзённы рабочы тыдзень. Вось такая стагнацыя, каб на яе ліха, атрымалася. Далей – болей. Цяпер ужо нават у гэтыя чатыры дні няпоўная занятасць рабочых здарылася. Не вытрымалі яны – абурыліся, мітынгам-пратэстам загулі. І давай у хвост і грыву чыхвосціць начальства. Маўляў, і беспрацоўе, і заробкі курам на смех. Во сарамоцце, во ганьба кіраўніцтву. І не толькі "вольтаўскаму", а і самаму высокаму – таму, што ў рэзыдэнцыях сядзіць.

Ну, гэта эпізод, зразумела. Штрышок, так бы мовіць. Праўда, такія глумлівыя штрышкі пачашчаюцца і пачашчаюцца. Кажуць, рабочых то тут, то там ахоплівае не тое што трывога і няўпэўненасць у заўтрашнім дні, а ўжо сапраўдная паніка. Каму ж па нутру перспектыва быць выпхнутым на вуліцу і застацца без скібкі хлеба? І без таго хапае ўжо па самую завязку беспрацоўных жабракоў. Каб жа ўвесь прэзыдэнцкі электарат не пераўтварыўся ў такіх да "канстытуцыйных" выбараў 2001 года. Не пазайздросціш тады гарапашніку Аляксандру Рыгоравічу.

Ён жа нядаўна на прэс-канфэрэнцыі ў Віцебску, дзе вырашаў лёс "славянскага базара", давяральна прызнаўся журналістам, што атрымлівае такую ж жабрацкую зарплату, як і ўсе. Дык нам, смяротным, што? Мы ж круціцца ўмеем. Нават на васьмі работах адразу. Дзе працуем, дзе падпрацоўваем, дзе падзарабляем. Глядзіш, ужо і штонікі можам купіць, а праз паўгода – жонцы сукенку. А яму, гаротнаму, як быць з жабрацкай зарплатай? Ці тым жа ягоным "вертыкальшчыкам" і ўсяму чыноўніцтву, якіх расплодзілася больш чым рабацяг? Таму мы вельмі і не здзіўляемся, калі, было, менавіта з нас, круцялёў, запатрабавалі дэкларацыі аб сукупным гадавым даходзе. З чыноўнікаў іх не патрабавалі. А навошта? Іх жа заробкі, як і ў прэзыдэнта, бы на далоні. Мабыць, жывуць яны зусім у нішчымніцы. Як пэнсіянэры ўсё роўна. Не дай Бог.

Дарэчы, кажуць, што Усявышняга часта апошнім часам успамінаюць у Крычаве. У першую чаргу на тамтэйшай мэблявай фабрыцы. Яна некалі славілася сваімі зручнымі і прыгожымі кухоннымі гарнітурамі. За гады прэзыдэнцкага запуску прадпрыемстваў на поўную моц фабрыка нешта занепала, змізэрнела. Думалі ўжо, што ранты ёй прыходзяць. Ды, відаць, Бог дапамог, бо на прадпрыемства знайшлі дарогу недалёкія ад Крычава расейскія фірмачы. Аблюбавалі яны фабрыку для распілоўкі свайго лесу. Расейцам гэта выгодна і абыходзіцца значна танней, чым у сябе дома. Рабочыя фабрыкі, канешне, у захапленні. Кухонныя наборы ўжо даўно не выпускаюцца, а яны ведай сабе пілуюць расейскі лес – бач, і на пракорм зарабляюць. Ды і галоўнаму інтэгратару Саюза ў абдымках з расейцамі дапамагаюць. На такой вось "інтэграцыі" фабрыка летась нават здолела 117 мільёнаў беларускіх чыстаганных "зайчыкаў" атрымаць. Ведама, хочаш жыць – умей круціцца.

А вось на мясцовым заводзе гумавых вырабаў круціцца, відаць, не жадаюць. Гэта ж трэба: тут за апошнія чатыры гады да шэрагу зношаны асноўныя вытворчыя фонды. Хаця ў іх, праўда, і ўзрост ужо "босых дзьмухаўцоў", таму, магчыма, і ў развалюх пераўтварыліся. Для іх абнаўлення і мадэрнізацыі патрэбны значныя валютныя ін'екцыі. А хіба яны ёсць у нашай самай працвітаючай, як нам кажуць, дзяржаве? У тым-та і справа. Калі б была валюта, дык Нацбанк дзеля выратавання курса рубля, што паляцеў у прорву, немінуча правёў бы грашовую інтэрвэнцыю. Такога не адбылося, і гэтым усё сказана: валюты няма. Няма і ў завода сваіх зваротных сродкаў. Таму застаецца толькі сузіраць, як, чахнучы, дапрацоўвае свой рэсурс да ручкі дабітая тэхналагічная лінія па выпуску галёш і спартыўнага абутку. У Крычаве з жудасцю падлічваюць, што праз пару гадоў заводу гумавых вырабаў зусім надыдзе амба. Як, дарэчы, і вытворчаму аб'яднанню "Крычаўцэментшыфер". Па той жа прычыне. Гэта ж колькі соцень рабочых, у адрозненне ад чыноўнікаў, апынецца не пры справе, дзякуючы прэзыдэнцкаму клопату пра запуск прадпрыемстваў!

Кажуць, што і мэр Магілёва такім запускам вельмі занепакоены. У абласным цэнтры добрая сотня самых розных вытворчасцяў, у тым ліку і нямала прадпрыемстваў-веліканаў, маналістаў у сваіх галінах. І амаль на ўсіх іх абсталяванне даўно ўжо стала фізычным і маральным перастаркам. Яшчэ крыху – і многія прадпрыемствы гатовыя працягнуць ногі.

Няўжо мелі рацыю тыя, што папярэджвалі: маўляў, Лукашэнку і яго камандзе з эканомікай не справіцца. Хто яго ведае, мо і не спраўляецца...

Ну і што? Затое ён, ні сіл міліцэйскіх, ні пракурорскіх, ні судовых, ні іншых кадэбэшных не шкадуючы, добра распраўляецца са свабодай асобы і друку, з правамі чалавека. Каб не рыпаліся. Хай бы сядзелі сабе дома ды па БТ глядзелі і слухалі прэзыдэнта, рынкаваму сацыялізму вучыліся, разуму набіраліся. Дык не! Прыдумалі нейкую Хартыю'97, усякія там "Дзяды", гадавіны БНР, "Чарнобыльскія Шляхі" ладзяць. А то і на мітынгі ды пікеты пруць, жахлівымі бел-чырвона-белымі сцягамі памяркоўны пэнсійны электарат палохаюць, горлапаняць, патрабуюць. Шматмільённымі штрафамі такіх трэба абкладваць, дубінкамі лашчыць. У "варанкі" іх, у суды, у турму!

І хай на тым праклятым Захадзе, дзе прэзыдэнцкую Беларусь "чорнай дзіркай" называюць, колькі хочуць абураюцца. Маўляў, рэжым дыктатарскі. Якая ж тут, пранцы на яе, дыктатура? Які ж тут дыктатар, ліха на яго? Няма ў нас гэтага. Няма. Аб тым і сам Аляксандр Рыгоравіч колькі разоў гаварыў, нас запэўніваў.

Няма, дык няма. Нам кажуць – мы верым.

Максім КАСТРЫЦА

ДА НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ТБМ

Дырэктар школы як апірышча антынацыяналізму

Міхась БУЛАВАЦКІ,
старшы выкладчык універсітэта, старшыня абласной арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

(Працяг. Пачатак у № 8 ТМ)

І ўсё ж "канфліктныя" класы з беларускай мовай навучання не складалі большасці. У пераважнай большасці бацькі спакойна пагаджаліся з навучаннем дзіцяці на беларускай мове, а ў некаторых (хай сабе й рэдкіх) выпадках актыўна настойвалі на гэтым. І калі ***па ініцыятыве адміністрацыі школ*** пачаўся працэс вяртання да расійскай мовы навучання, наколькі маглі, супраціўляліся яму.

Некалькі разоў бацькі з розных школ звярталіся да ТБМ, паведамляючы пра тое, што ад іх патрабуюць напісаць заявы аб пераводзе дзіцяці на расійскую мову навучання (такія паведамленні прыходзілі не толькі з магілёўскіх школ, але і з іншых гарадоў, напрыклад, ад бацькоў школы № 28 г.Бабруйска). На жаль, умяшальніцтва ТБМ праз адпаведныя органы адукацыі толькі крыху замаруджвала гэты працэс, не спыняючы яго.


Характэрныя падзеі, якія адбываліся ў школе № 42 г.Магілёва. У пачатку навучальнага года бацькі аднаго з пятых класаў не пагадзіліся на расійскамоўнае навучанне і клас застаўся беларускамоўным. У гэты клас быў нават пераведзены адзін з вучняў суседняй школы, бо там мова навучання была зменeная. Тым не менш, ужо ў сярэдзіне навучальнага года (!) усіх пяціклаcнікаў 42-й школы сталі вучыць на расійскай мове. Аргументацыя традыцыйная: не хапае беларускамоўных падручнікаў (успомнім У.Булыбенку – "штучна створаная праблема"), не хапае настаўнікаў з веданнем беларускай мовы (яшчэ адна штучная праблема, бо калі перад настаўнікам паставіць мэту праз год-два ведаць беларускую мову, то для большасці гэта не стане праблемай; сцвярджаць іншае – гэта значыць не паважаць настаўніка), і – "бацькі так захацелі". Цікавая з'ява: у пачатку года бацькі не хацелі, а ў сярэдзіне захацелі. Але не цяжка паверыць: калі бацькам з дня ў дзень дзяўбці пра недахоп падручнікаў і пра настаўнікаў, якія не валодаюць мовай, то ўрэшце тыя здадуцца і махнуць рукой – вучыце на расійскай мове, абы дзіця што ведала!

У тым, што "бацькі захацелі" менавіта пад напорам кіраўніцтва школ, я пераконваўся шмат разоў. Вось яшчэ адзін досыць выразны факт. У канцы жніўня 1996 года зайшоў да дырэктара сярэдняй школы № 11 пацікавіцца, колькі беларускамоўных першых класаў збіраюцца там адкрываць. Выявілася: ні воднага – "бацькі не хочуць". Тады я напрасіўся на бацькоўскі сход, каб самому пачуць гэтае "не хочуць". "Прыходзьце, калі ласка," – запрасілі мяне і назвалі дату і час сходу. У названы дзень і час я прыйшоў у школу, але школа была зачыненая. Потым высветлілася, што сход бацькоў першакласнікаў прайшоў напярэдадні. "Вы б стварылі для нас праблемы," – задаволіла маю цікаўнасць аб прычыне пераносу сходу намеснік дырэктара. А хто б падумаў аб праблемах, якія ствараюць кіраўнікі школ для беларускага народа?

Падводзячы рысу пад усім вышэйсказаным, можна адзначыць, што натуральны працэс адыходу ад беларускамоўнага навучання не быў бы такім масавым, такім абвальным, калі б ён не правакаваўся адміністрацыямі школ. Што падштурхоўвала дырэктараў школ і іх намеснікаў да такіх крокаў? З боку органаў адукацыі (прынамсі па г.Магілёве) ніякіх загадаў па згортванні беларускамоўнай адукацыі не было. Хутчэй за ўсё, тут праявілася асабістае імкненне кіраўнікоў школ пазбавіцца ад "лішніх" турботаў, якія стварала двухмоўнае навучанне. Рашэнне знойдзена не на карысць роднай мовы, якую амаль ніхто з іх не ведае, а той, хто больш-менш ведае, не карыстаецца ёю ў паўсядзённым жыцці, як роднай мовай. Характэрна і тое, што некаторыя з іх выкладаюць беларускую мову, але беларуская мова для іх – толькі сродак атрымання заробку. Па-за межамі школы (нават па-за межамі класа!) яны пераходзяць на няродную, але звыклую іншую мову. І вось гэта ёсць, на маю думку, самае небяспечнае для беларускай мовы – настаўнік беларускай мовы, які беларускай мовай у побыце не карыстаецца, – бо такі настаўнік з дня ў дзень дэманструе сваім вучням непатрэбнасць беларускай мовы, яе рэальны адыход у нябыт. Вучні, з маленства прывучаныя да такой думкі, потым вырастаюць у агрэсіўных супраціўленцаў вяртанню беларусаў да жывой (жывой!) роднай мовы.

І цяпер праблема перастае быць праблемай школы і становіцца агульнагарадской, праблема перадаецца органам адукацыі. Першапачатковае яе рашэнне бачыцца такім: у кожным раёне горада павінна быць створана адна беларускамоўная школа. Яна павінна быць размешчана так, каб да яе быў зручны пад'езд з любога кутка гэтага раёна. І для гэтай школы трэба знайсці такіх настаўнікаў (а перш-наперш дырэктара), якія не толькі ведаюць мову, але і карыстаюцца ёю ў паўсядзённасці, г.зн. для якіх беларуская мова сапраўды родная. Такія настаўнікі ёсць. І аўтар гэтых радкоў – адзін з тых, хто гатовы пайсці ў такую школу выкладаць матэматыку.

Канешне, праблемы тут ёсць, і немалыя. Але ўсякія праблемы вырашальныя, калі за іх вырашэнне брацца з жаданнем і ахвотай.



Іншая справа "Саюз непарушны"?..

"Содружество независимых государств находится в состоянии клинической смерти и лежит в реанимации".

З выступлення А. Лукашэнкі на міжпарламенцкай сэсіі Расеі і Беларусі ў Гомлі 4 траўня 1998 г.

Абвестка

Ты – беларус? Ты хочаш ведаць гісторыю свае Бацькаўшчыны й чытаць беларускіх аўтараў на роднай мове?

Калі так, то мы радыя прапанаваць табе кнігі й касэты. За даведкамі зьвяртайся ў аўторак і чацьвер з 18-й гадзіны па тэлефоне 31-04-39 (Сяржук), і ў любы час – па тэлефоне 25-57-85 (Алесь).

Аб'ява Магілёўскага таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны

14–15 траўня 1998 года Магілёўскае ТБМ імя Францішка Скарыны праводзіць навукова-практычную канфэрэнцыю "Беларуская мова: стан ужытку пасля рэфэрэндуму".

Запрашаюцца да ўдзелу навукоўцы, настаўнікі, журналісты, грамадскія і дзяржаўныя дзеячы. Да пачатку канфэрэнцыі будзе выдадзены зборнік. Тэзісы ў памеры да 3-х старонак дасылаць на адрас: 212038, Магілёў, праспэкт Дзімітрава, 54-153.

Іншую інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах: 42-44-40, 26-70-86, 22-70-51.

АРГКАМІТЭТ

Магілёўскі тэатр лялек

21-ы тэатральны сэзон

Рэпэртуар на травень:

2 – "Русалочка" Х-К. Андерсена
3, 17 – "Красная Шапочка" П. Кондрусевича
9, 10 – "Тры казкі Папугая" А. Жугжды
16 – "Прынцэса на гарошыне" Х-К. Андэрсэна
30, 31 – Премьера. "Сказка о трёх поросятах" Лоры Ли.
Закрытие театрального сезона.

Пачатак спэктакляў a 12-й гадзіне.

Каса працуе з 10-й да 17-й, акрамя панядзелка.

Прымаюцца заяўкі ад калектываў.

Даведкі па тэлефонах: 25-84-89, 25-64-46.

Мастацкі кіраўнік тэатра Алег ЖУГЖДА

ДА НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ

Да сустрэчы, сябры і паплечнікі!

Пэўна, не адныя мы, супрацоўнікі ТЫДНЁВІКА, заўважаем адметную асаблівасць найноўшага перыяду беларускай гісторыі: імклівасць бегу фізычнага часу пры павольнасці і нават застоенасці часу гістарычнага... Гэткае, так бы мовіць, розначасавае жыццё стамляе як нішто іншае. Зразумела, найперш – маральна. А маральная цяжкасць значна больш небяспечная, чымсьці тая, што прыгнятае цела.

Таму лета – гэта падарунак лёсу. Давайце паімкнемся выкарыстаць яго для назапашвання новых сілаў для восені, якая чакаецца палітычна-гарачай і дзейснай. Акрамя палітыкі (хаця куды ад яе ў нашым становішчы падзецца?) сілы – і сродкі! – патрэбныя будуць і для выпраўлення дарослых дзяцей у жыццё. І для назапашвання сямейных прыпасаў на зіму. І на тое, каб у добрым настроі яе перажыць... Ды ці мала на што яшчэ!

Нешта цікавае і значнае ў грамадскім жыцці будзе, зразумела, адбывацца і летам. Аднак жа нашае летняе маўчанне (а газэта робіць перапынак) не паўплывае адмоўна на вашую інфармаванасць і настрой. Не сумняваемся, што і вы, нашыя прыхільныя чытачы, гэты час аддадзіце найперш адпачынку, дзецям, сядзібным клопатам, падарожжам і вандроўкам. А мець ясную галаву і ўсвядомленыя думкі для прыняцця рашэнняў – раней, чым увосень – нам з вамі не спатрэбіцца. Так падказвае нам наш досьвед і нашае прадбачанне. Таму мы спакойныя. Верым, што летам, магчыма, дадуць лепшыя ўзыходы і тыя зярняткі праўды, сумлення і свядомасці, якія ТЫДНЁВІК нястомна сеяў у чытальніцкім асяродку ўвесь безперапынны першы год свайго існавання. Нішто не гіне дарэмна...

Час разлукі прабяжыць, спадзяемся, хутка і неўпрыкмет. Тым радасней будзе сустрэча. Да яе і вы, нашыя сябры і паплечнікі, і мы ў нечым станем іншымі, лепшымі. Час перапынку мы выкарыстаем і для гэтага: для надання ТЫДНЁВІКУ новай моцы, новага стылю, новых тэмаў. Адному толькі не здрадзім, як і вы, – Бацькаўшчыне, веры ў тое, што яна вартая волі і незалежнасці, дабрыні і шчасця.


Да сустрэчы, сябры! Дзякуй пакуль усім за падтрымку, удзел у газэце, за пісьмы і званкі, заўвагі і шчырую крытыку. Усё вартае, усё патрэбнае паміж паплечнікамі і сябрамі. Нішто не гіне дарэмна... Добрага і цікавага вам лета!

ЗАСНАВАЛЬНІК І РЭДАКЦЫЯ



Рэдактар Генадзь СУДНІК





Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадской асацыяцыяй "КОЛА СЯБРОЎ".

Зарэгістравана ў Дзяржкамітэце Рэспублікі Беларусь па друку за № 831.

Газэта выходзіць па пятніцах, пераважна на беларускай мове.



Кошт аднаго асобніка газэты ў гандлі праз сістэму Саюздруку — 3.000 рублёў. У свабодным продажы і ў грамадскіх распаўсюджвальнікаў — па дамоўленасці.



АДРАС РЭДАКЦЫІ: 212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.

ТЭЛЕФОНЫ: 31-04-15, 22-97-82



Газэта надрукавана афсетным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 9. Наклад 1.100 асобнікаў.